## Гаспадар Беларускіх пушчаў размнажаецца і ў Літве

Ён стаіць насупраць, скіраваўшы ў мой бок свае вострыя чорныя рогі. Яго вялікія цёмныя вочы, адасобленыя адно ад аднаго шырокім калматым ілбом, свідруюць мяне, нараджаючы трывогу і нават жах. Пачуццё небяспекі павялічвае і буйны карак, які плаўна пераходзіць у велічэзную тушу. Гэта згустак неўтаймаванай сілы, сапраўдная жывая машына моцы. Перада мной — самы вялікі і самы моцны звер у сучаснай Еўропе. Зубр.

Інстынктыўна адступаючы назад, я хутка зашчоўкаў фотаапаратам і, не выпрабоўваючы лёс, забег за выратавальную загароду. Добра, што сустрэча з буйным самцом адбылася не ў дзікім лесе, а ў гадавальніку.

— Нават выгадаваны ў нас зубр — жывёла дзікая. Памятаю, як аднойчы вырашыў зайсці ў пастаўнік — паправіць корм. Узяў вілы, выпнуў іх перад сабой і іду, а зубры не адыходзяць. Думаю, памахаю віламі — разбягуцца ў бакі. Самец насамрэч адскочыў, а самка, якая вырашыла, што я пагражаю яе маломў, наадварот, рушыла проста на мяне. Сам не адчуў, як перакінуўся цераз двухмятровы плот — тады быў яшчэ малады. З зубрамі лёс лепш не выпрабоўваць, — смяецца Рутас ПАПШЫС, які ўзначальвае зуброўнік на працягу многіх гадоў.

Цяпер у Пашыляйскім зуброўніку, што знаходзіцца ў Панявежскім раёне, жыве 21 зубр. Самаму маладому — усяго месяц. Самка Гіедрэ ўсіх здзівіла: абзавялася патомствам узімку. Звычайна зубраняты з'яўляюцца на свет у канцы вясны.

Маладняк — гэта заўжды добра, гэта надзея і ўпэўненая будучыня. Але ўсё магло быць інакш. Зубрыныя статкі, якія гулялі па Літве з даўніх часоў, у апошнія стагоддзі зведалі вынішчэнне. Зубр — гэта гара мяса: вага здаровага самца дасягае тоны. Ён заўжды быў жаданым паляўнічым трафеем. Аднак стрэлы адбываліся часцей, чым роды самак. Апошняга зубра ў Літве застрэлілі ў 1854 годзе. Больш за 100 гадоў у Літве не было гэтых цудоўных стварэнняў. Калі грамадскасць стала гаварыць пра аднаўленне папуляцыі зубра ў Літве ўсё больш настойліва, дапамогу аказалі беларускія сябры. Кіраўнік Пашыляйскага зуброўніка ахвотна пагадзіўся на інтэрв'ю, калі даведаўся, што я збіраю матэрыял для беларускай газеты "Звязда".

— Першая пара белавежскіх зуброў была прывезена сюды ў 1969 годзе. У 1970 годзе прыбыло шэсць, у 1972 — яшчэ два зубры. Так пачалося новае адгалінаванне белавежскіх зуброў, — кажа Папшыс. — Праз год у першай пары з'явілася патомства. Зубраня назвалі Гірыніс (Лясны). З тых часоў усе зубры, якія нараджаюцца ў Літве, атрымліваюць, у адпаведнасці з міжнароднай дамоўленасцю, імёны, якія пачынаюцца літарамі "Гі".

Статак натуральна павялічваўся. Ужо ў 1973 годзе першыя пяць зуброў былі выпушчаныя з пастаўніка ў Пашыляйскі лес. Яшчэ па два зубры было выпушчана ў 1975 і 1976 гадах. Так у Літве пачалося фарміраванне статка зуброў, якія жывуць вольна. У лесе яны таксама пачалі размнажацца. У 1977 годзе на волі жыло ўжо 13 белавежскіх зуброў. Колькасць зуброў, якія жывуць вольна, расла натуральным шляхам, а таксама з прыросту, які атрымлівалі ў зуброўніку.

За сорак гадоў існавання Пашыляйскага зуброўніка ў ім нарадзілася амаль 140 зубранят, на волі — каля 80. Вольных звяроў стала цяжка злічыць. Яны сталі скрытнымі, разбрыліся далёка ад месца, дзе былі выпушчаны. Іх заўважалі нават у лясах, аддаленых ад зуброўніка на сотні кіламетраў.

Зуброўнік пашырылі. Ён цяпер займае плошчу ў 50 га, з якой 18 гектараў — паша, а астатняе — падлесак і лес. Зубры жывуць не як у заасадзе, а як у дзікай прыродзе. Падкормка — толькі ўзімку. Зуброўнік стаў вельмі папулярным. Яго наведваюць тысячы турыстаў, вельмі шмат замежнікаў, бо цяпер рэдкая дзяржава можа пахваліцца зубрамі, якія жывуць дзіка. Нядаўна пабудавалі прасторную назіральную пляцоўку, з якой зручна сачыць за жыццём зуброў і не парушаць іх спакой.

На волі зубры, відаць, больш шчаслівыя, але жыць там нашмат цяжэй. Звяры яны моцныя, дарогу саступаць не прывыклі, таму і машыну, якая імчыцца па дарозе, могуць сустрэць горда. Яны тонуць у багне. Не застрахаваны, на жаль, і ад браканьерскай кулі, хоць штрафы за забітага зубра вельмі вялікія.

Два гады таму ў Кедайнянскім раёне няўдалы паляўнічы з Нарвегіі, не разгледзеўшы, у каго страляе, забіў зубра. Гэты стрэл абышоўся яму ў 2600 долараў.

Вольныя зубры, на няшчасце, часцяком уступаюць у канфлікт з фермерамі, у якіх палі побач з лесам. Дзікаму звяру не растлумачыш, што кукуруза, якая так смачна пахне, цукровыя буракі і зялёныя азімыя — не яму. За такія візіты зуброў з фермерамі расплачваецца дзяржава. Прыязджае камісія, падлічвае ўрон, зроблены зубрамі, і фермер атрымлівае грашовую кампенсацыю. Атрымлівалі кампенсацыю і за кароў, якія нараджалі цялят ад зуброў. Нягледзячы на тое, што агульная сума кампенсацыі з кожным годам павялічваецца, у Літве ніхто не задумваецца, што час штучна прыпыняць рост колькасці зуброў.

Развітваючыся, Р. Папшыс паказаў двух зуброў — пяцігадовага самца і трохгадовую самку.

— Іх мы нядаўна прывезлі з Польшчы. Памяняліся зубрамі, таму што карысна скрыжоўваць звяроў, якія не знаходзяцца ў блізкіх роднасных сувязях. Іх патомства заўжды мацнейшае, здаравейшае, — сказаў ён. — Хачу перадаць беларускім калегам, што патомкі зуброў Белавежскай пушчы тут у добрым здароўі. Але з тых часоў прайшло ўжо некалькі зубровых пакаленняў, і мэтазгодна абмяняцца некалькімі звярамі. Свежая кроў толькі ўмацуе нашы статкі.

***Вітаўтас ЖЭЙМАНТАС, уласны карэспандэнт "Звязды" ў Літве.***

**Источник:** Звязда.-2012.-№ 13 (13 студз.).-С.3.